Калі ў свеце згасне сонца, месяц і зоркі, і людзі, быццам краты, будуць навобмацак шукаць дарогу, мы, як горкаўскія Данкі, святлом сваіх ведаў пакажам ім правільны шлях і самі не згубімся на шырокай дарозе. Нас шмат, студэнтаў і выпускнікоў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, мы спадчыннікі вялікіх прафесій, у нас ёсць сілы і ўпартасць даказаць гэта.

Мы рознакаляровыя агеньчыкі, якія збіваюцца ў групы і ляцяць у верным напрамку. Мы спецыялісты і з гонарам нясем і будзем несці адказнасць за сваю справу. Сукупнасць агеньчыкаў створыць кола злучаных рук і пойдзе па жыццёвай дарозе, рассейваючы цемру непісьменнасці.

Мы след у след ідзём за вялікімі вучонымі і даследчыкамі, і нашыя сляды не зарастуць быллём.

Нам, як і тысячам да нас, пакажа шлях Скарынаўскае сонца і месяц, мы годныя гэтага.

Мы інтэлігенты, дзякуючы нам не памрэ ніводнае слова вялікіх настаўнікаў, сонца зменіцца месяцам, памяняецца надвор’е, дрэвы вырастуць, і ўжо нас будуць называць вялікімі.

***Яна Васькевіч, студэнтка***
***філалагічнага факультэта, 4 курс***